# § 42. Японія

*Як скончылася Другая сусветная вайна для Японіі?*

Пасля капітуляцыі Японіі 2 верасня 1945 г. краіна была акупавана амерыканскімі войскамі, што дзейнічалі ад імя саюзных дзяржаў. З таго часу і да Сан-Францыскага мірнага дагавора вярхоўная ўлада ў краіне знаходзілася ў руках ЗША. Палітыка саюзных дзяржаў прадугледжвала выкараненне ў Японіі мілітарызму і дэмакратызацыю грамадства.

**Пасляваенная Японія.** Пад кіраўніцтвам амерыканскага генерала *Дугласа Макартура* акупаваная Японія зведала самыя радыкальныя рэформы з часоў рэвалюцыі Мэйдзі. У краіне былі ліквідаваны палітычная паліцыя і жандармерыя, ваеннае і марское міністэрствы, а таксама міністэрства ўнутраных спраў, выпушчаны на волю палітычныя вязні. Камеры, што вызваліліся ў турмах, запоўнілі японскія ваенныя злачынцы. Адначасова пачалася чыстка дзяржаўнага апарату, сродкаў масавай інфармацыі і сферы адукацыі ад асоб, якія супрацоўнічалі з мілітарыстамі. Пад гэтыя рэпрэсіі падпала да 200 тыс. чалавек. Пад суд былі аддадзены 28 прадстаўнікоў кіроўных вярхоў Японіі, 7 з іх былі пакараны смерцю.

Буйныя манаполіі (дзайбацу) былі распушчаны, раздроблены на дзясяткі кампаній, іх аперацыі апынуліся пад амерыканскім кантролем. Такім чынам, ЗША аслаблялі свайго асноўнага гандлёва-прамысловага канкурэнта ва Усходняй Азіі.



Ваенная база ЗША на востраве Акінава

Правообладатель Издательский центр БГУ

Паступова ў Японіі аднавілі дзейнасць палітычныя партыі і прафсаюзы. 10 красавіка 1946 г. прайшлі ўсеагульныя выбары ў парламент. Затым была апублікавана новая Канстытуцыя, распрацаваная ў штабе акупацыйных войскаў. Яна ўступіла ў сілу *3 мая 1947 г.*

Абсалютная манархія ліквідоўвалася, а імператар быўператвораны ў «сімвал адзінства нацыі» і пазбаўлены палітычнай улады. Носьбітам суверэннай улады ў Японіі быў абвешчаны народ. Згодна з новай Канстытуцыяй грамадзянамі сталі лічыцца як мужчыны, так і жанчыны. Уводзілася ўсеагульнае выбарчае права, скасоўвалася патрыярхальная сямейная сістэма, дэкларавалiся грамадзянскія правы. Канстытуцыя прадугледжвала парламенцкую сістэму брытанскага ўзору з выбарным кабінетам, адказным перад палатай прадстаўнікоў. Самым знамянальным наваўвядзеннем стаў 9-ы артыкул Канстытуцыі, які абвяшчаў адмову японскага народа ад вайны. Існаванне ў краіне ўзброеных сіл не дапускалася.

Радыкальныя змяненні адбыліся ў аграрнай сферы. Зямельная рэформа прывяла да адчужэння зямлі ў памешчыкаў і продажу яе па льготных цэнах сялянам-арандатарам. У выніку ў японскай вёсцы ўтварыўся шматлікі слой сялян-уласнікаў. У лістападзе 1948 г. амерыканцы прапанавалі японскаму ўраду свой план эканамічнай праграмы — курс «шокавай тэрапіі». Але гэта не прынесла чаканага выніку. Краіну ахапіла працяглая інфляцыя.

Выратавала японскую эканоміку вайна ў Карэі (1950—1953). Японія ператварылася ў тылавую базу амерыканскіх войскаў, што справакавала ў краіне своеасаблівы эканамічны бум. За гады вайны валавы нацыянальны прадукт (ВНП) Японіі павялічыўся ў два разы. Яна станавілася стратэгічным саюзнікам ЗША. Ужо да 1957 г. было завершана пасляваеннае аднаўленне эканомікі.

**Сан-Францыскі дагавор.** У *1951 г.* у *Сан-Францыска* адбылася мірная канферэнцыя, якая падвяла вынікі вайны на Ціхім акіяне. Акупацыя Японіі завяршылася. Адначасова паміж Японіяй і ЗША быў заключаны Дагавор бяспекі, які прадугледжваў захаванне на японскай тэрыторыі амерыканскіх ваенных баз. Урад Японіі скараціў ваенныя выдаткі да мінімуму і зрабіў асноўны ўпор на эканамічнае развіццё. У 1956 г. была падпісана савецка-японская Сумесная дэкларацыя, якая нармалізавала адносіны паміж абедзвюма краінамі. СССР абяцаў падтрымаць просьбу Японіі аб уступленні ў ААН. Аднак мірны дагавор бакі так і не заключылі.

№ 41

У студзені 1960 г., у разгар «халоднай вайны», Вашынгтон і Токіа заключылі новы Дагавор бяспекі. Правы амерыканскіх вайскоўцаў у Японіі ўразаліся, але самі ваенныя базы заставаліся недатыкальнымі. Скарыстаўшыся гэтым, Савецкі Саюз у аднабаковым парадку перагледзеў умовы Сумеснай дэкларацыі і адмовіўся абмяркоўваць тэрытарыяльныя прэтэнзіі Японіі. Гэта прыкметна ўскладніла савецка-японскія, а затым і расійска-японскія адносіны.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Эканамічнае развіццё.** Развіццё японскай эканомікі ў пасляваенны перыяд было выключна паспяховым. За 15 гадоў (1958—1973) ВНП Японіі павялічыўся ў 6,5 раза, а аб'ём прамысловай вытворчасці — у 10 разоў. У свеце пачалі гаварыць пра «японскі эканамічны цуд». Да канца 1960-х гг. краіна заняла другое месца ў свеце па аб'ёме прамысловай вытворчасці, а ў пачатку 1970-х — і па аб'ёме ВНП.

Існавалі дзясяткі прычын «эканамічнага цуду» Японіі. Найважнейшай з іх было рэгуляванне дзяржавай сацыяльна-эканамічнай сферы. Ажыццяўляліся дзяржкантроль над экспартам-імпартам капіталу; пратэкцыянізм у гандлёвай сферы, усялякае заахвочванне імпарту сучасных заходніх тэхналогій; падтрымка нацыянальнага вытворцы; спыненне банкаўска-фінансавых спекуляцый; прымяненне строгіх санкцый да японскіх фірмаў, якія канкурыравалі паміж сабой на сусветным рынку.

Аж да канца 1960-х гг. тэмпы росту эканомікі забяспечваліся высокай ступенню эксплуатацыі рабочай сілы. Праца японца аплачвалася ў 3—5 разоў меней, чым праца амерыканскага рабочага. Японія шырока выкарыстоўвала навукова-тэхнічныя дасягненні краін Захаду. Яна закупляла за бясцэнак дзясяткі тысяч ліцэнзій і патэнтаў, дапрацоўвала іх і хутка ўкараняла ў вытворчасць. Варта ўлічваць і тое, што Японія будавала эканоміку ва ўмовах адсутнасці ваенных выдаткаў.

Немалаважную ролю адыгралі канфуцыянскія каштоўнасці японцаў, а таксама наяўнасць адной з лепшых у свеце сістэм адукацыі і прафарыентацыі. Дзякуючы гэтаму японцам удалося ажыццявіць «рэвалюцыю якасці» — галоўнай умовы канкурэнтаздольнасці японскіх тавараў на сусветным рынку.

Аднак сучасная японская эканоміка надзвычай неабаронена. Яна шмат у чым залежыць ад краін, якія валодаюць сыравіннымі рэсурсамі або кантралююць іх здабычу і транспарціроўку. Толькі 17 % тэрыторыі краіны прыдатныя для сельскагаспадарчай вытворчасці, таму існуе харчовая залежнасць ад ЗША. Акрамя таго, на долю Злучаных Штатаў прыпадае 20 % японскага экспарту. Рынкі краін,




ВУП 10 найбольш развітых краін свету ў 2018 г. (трлн долараў)

Правообладатель Издательский центр БГУ



Імператар Акіхіта з жонкай наведваюць тэрыторыі, разбураныя землятрусам, у прэфектуры Фукусіма. 2011 г.

што сталі на шлях развіцця, на якія арыентаваны японскі экспарт, таксама знаходзяцца пад кантролем краін Захаду.

**Палітычнае развіццё.** Палітычная сістэма Японіі пасля Другой сусветнай вайны грунтавалася на шматпартыйнай парламенцкай дэмакратыі з захаваннем імператара ў якасці намінальнага кіраўніка дзяржавы. У студзені *1989 г.* 125-м імператарам Японіі стаў 55-гадовы Акіхіта. У 2019 г. на прастол узышоў прынц Нарухіта.

Умацаванне левых партый, актыўнасць рабочага руху, нарастанне барацьбы супраць выкарыстання атамнай зброі і існавання амерыканскіх ваенных баз на тэрыторыі Японіі падштурхнулі буржуазныя партыі да аб'яднання. У *1955 г.* была створана *Ліберальна-дэмакратычная партыя (ЛДП)*. Яна прадстаўляла інтарэсы манапалістычнага капіталу, але выкарыстоўвала лозунг стварэння «дзяржавы ўсеагульнага дабрабыту». ЛДП да пачатку 1970-х гг. заставалася самай уплывовай партыяй Японіі дзякуючы славе арганізатара «эканамічнага цуду». Аднак міжфракцыйныя супярэчнасці і карупцыя прыкметна знізілі яе папулярнасць. У 1980—1990-я гг. працягвалася пашырэнне шматпартыйнай сістэмы, абвастрылася барацьба за выбаршчыкаў. У 1993 г. настаў канец манаполіі ЛДП. Да ўлады ў Японіі прыйшоў кааліцыйны ўрад.

У другой палове 1990-х гг. адбылася перагрупоўка палітычных сіл. Самым значным апанентам ЛДП у пачатку XXI ст. стала цэнтрысцкая *Дэмакратычная партыя*, якая знаходзілася пры ўладзе з 2009 па 2012 г. Другой па колькасці апазіцыйнай партыяй была Партыя чыстай палітыкі (Камэйта), створаная адной з будыйскіх груп. Цяпер яна падтрымлівае ЛДП, што знаходзіцца на чале ўлады, і яе намаганні па пераглядзе 9-га артыкула Канстытуцыі. У 2015 г. быў прыняты законапраект, які дае Японіі права ўдзельнічаць у ваенных аперацыях за мяжой.

**Сучасная Японія.** З канца 1980-х гг. сталі з'яўляцца першыя прыкметы крызісу ў японскай эканоміцы. У 1991 г. пачалася надзвычай зацяжная дэпрэсія. Ужо ў 1992 г. рост ВНП Японіі прыпыніўся, у 1993 г. ён склаў усяго 0,1 % ад узроўню 1992 г. Вясной 1995 г. беспрацоўе ўзрасло да 3,2 % (самае высокае з 1953 г.).

Правообладатель Издательский центр БГУ

Крызісныя з'явы высвецілі сур'ёзныя праблемы: адставанне ў сацыяльнай сферы, зніжэнне канкурэнтаздольнасці японскіх тавараў на сусветным рынку, рост долі пенсіянераў у грамадстве, рэзкае павышэнне цэн на нерухомую маёмасць, залежнасць ад амерыканскіх тэхналогій, адсутнасць прарываў у вядучых галінах (авіябудаванне, асваенне космасу і інш.).

У знешняй палітыцы Японія накіравала ўсе намаганні на наладжванне дыпламатычных адносін з суседзямі. Асновай сучаснай знешняй палітыкі застаецца саюз з ЗША, якія захоўваюць у Японіі свае ваенныя базы. У 1987 г. было заключана пагадненне аб удзеле Японіі ў праграме «зорных войнаў». З лістапада 1975 г. яна стала ўдзельніцай усіх штогадовых сустрэч кіраўнікоў найбольш развітых капіталістычных краін — «вялікай сямёркі». Дзелавыя колы Японіі прапрацоўваюць варыянты арганізацыі «азіяцкай зоны свабоднага гандлю». Мяркуецца, што ў яе нароўні з Японіяй увойдуць Паўднёвая Карэя, Тайвань, Сінгапур, Ганконг, Тайланд і Малайзія. Вялікую ўвагу Токіа надае наладжванню адносін з Пекінам. Японія разглядае Кітай як перспектыўны ёмісты рынак для сваіх тавараў, а таксама крыніцу энерганосьбітаў і іншых відаў сыравіны.

1. Якія асноўныя праблемы неабходна было вырашыць у Японіі пасля заканчэння Другой сусветнай вайны? У чым праяўлялася дваістасць палітыкі ЗША ў краіне?
2. Якія змяненні былі ажыццёўлены ў дзяржаўным уладкаванні Японіі ў пасляваенны перыяд? Пабудуйце схему яе дзяржаўнага ладу ў адпаведнасці з Канстытуцыяй 1947 г.
3. Якія прычыны садзейнічалі японскаму «эканамічнаму цуду»? Параўнайце «эканамічны цуд» у Германіі і Японіі.
4. Складзіце табліцу «Асноўныя палітычныя партыі Японіі».

| Дата стварэння | Назва палітычнай партыі | Чые інтарэсы прадстаўляе |
|---|---|---|
| | | |

5. Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае становішча Японіі ў канцы XX — пачатку XXI ст.
6. Якія асноўныя кірункі знешняй палітыкі Японіі ў пасляваенныя гады? У чым заключаецца асноўная дактрына яе сучаснай знешняй палітыкі?
7. Як складваліся адносіны Японіі з СССР, а затым — з Расійскай Федэрацыяй?

Як вы думаеце, чаму, нягледзячы на неаднаразовыя абвінавачванні ў карупцыі і злоўжываннях уладай, Ліберальна-дэмакратычная партыя не страціла падтрымкі японскіх выбаршчыкаў?

Правообладатель Издательский центр БГУ